ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
1 ВЕРАСНЯ
НЯДЗЕЛЯ
№ 24 (1474)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА


## Беларускі універсітэт — ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА - СЁННЯ - ЗАЎТРА»

### У XII СУСВЕТНЫМ

фестывалі моладзі і студэнтаў у Маскве прынялі ўдзел самадзейныя артысты БДУ імя У. І. Леніна — народны ансамбль танца «Крыжачок» і Алег Ацьман, выкладчык філалагічнага факультэта, аўтар і выканаўца самадзейных песень. У час работы фестывалю яны ўдзельнічалі ў творчых сустрэчах з мастацкімі калектывамі рэспублікі і краіны, у мітынгах, а таксама ў тэатралізаваным прадстаўленні «Мір пераможа вайну», выступалі з канцэртамі ў Міжнародным парку мастацтваў на Беларускім комплексе, на іншых масавых пляцоўках.

У. МАКАРЭВІЧ,
дырэктар студэнцкага клуба.

### ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

падрыхтавалася фундаментальная бібліятэка БДУ імя У. І. Леніна. Супрацоўнікамі адрэдагавана картатэка кнігазабяспечанасці вучэбнай літаратурай, чытальныя залы папоўніліся новымі выданнямі, якія дапамогуць у вучэбным працэсе. Студэнты змогуць пазнаёміцца з выстаўкамі «1 верасня — свята ведаў», «Студэнту аб рабоце з кнігай», а пяцікурснікам, якія будуць праходзіць педпрактыку, у многім дапаможа тэматычны падбор літаратуры «Шчаслівых урокаў, настаўнік!».

Гатовы прыняць студэнтаў і бібліятэкі на юрыдычным і філалагічным факультэтах, факультэце радыёфізікі і электронікі, на падрыхтоўчым аддзяленні для замежных грамадзян.

М. АНАТОЛЬЕВА.

### СА СВЯТОЧНЫМ КАНЦЭРТАМ

у Дзень ведаў выступяць калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта. Свае канцэртныя праграмы вынясуць на суд гледачоў народны ансамбль танца «Крыжачок», народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш», народны аркестр народных інструментаў, народная харавая капэла, народная агітбрыгада і іншыя калектывы.

І. КЕЗІК.

### ЗАКОНЧЫЎ РАБОТУ

спартыўна-аздараўленчы лагер «Нарач», які працаваў у пяць змен. У ім адпачывалі і папраўлялі сваё здароўе савецкія і замежныя студэнты.

Н. ТУРОМША,
намеснік старшыні
студэнцкага прафкома.

ЖЫЦЦЁ пульсуе год за годам,
Вяршыць яно кругаварот.
І вераснёўскіх кветак водар
Нам сэрцы поўніць кожны год.

Сягоння дзень такі адметны —
Паклікаў верасень званком.
Сягоння дзень на дзіва светлы,
І светлы ведаў нашых дом.



## Я — СТУДЭНТКА!

*АДКАЗ БЫЎ ВЫДАТНЫМ. Гэта Таццяна Сахарэвіч разумела сама. Бачыла яна, як экзаменатар вывеў у экзаменацыйным лісце «выдатна». І усё ж калі выйшла з аўдыторыі, не стрымалася, разгарнула сваю «абітурыенцкую залікоўку». Тут жа абступілі Таню дзяўчаты з групы.*

*Пасыпаліся пытанні:*

*— Ну што?*

*— Выдатна!*

*А пасля:*

*— Малайчына.*

*— Віншуем!*

*І зноў пытанні:*

*— Што выцягнула?*

*— Ці цяжка адказаць на пяцёрку?*

*Збылася мара! А яна паявілася ў Таццяны даўно. Яшчэ ў сёмым класе вырашыла дзяўчына, што стане настаўніцай. Таму пасля школы, якую закончыла з залатым медалём, падала дакументы на рускае аддзяленне філалагічнага факультэта.*

*Фота В. ГРАМОВІЧА.*

# СА СВЯТАМ ВЕДАЎ!

СЕННЯ мы адзначаем Дзень ведаў. Іменна гэтым вераснёўскім ранкам па традыцыі людзі розных узростаў адпраўляюцца ў падарожжа за ведамі: нехта робіць толькі першыя крокі, нехта працягвае шлях да вяршынь навукі.

Мы здалёк ішлі да гэтай урачыстасці. Факт існавання свята, якога, бадай, пакуль няма нідзе ў свеце, наводзіць на роздум. Тры чвэрці насельніцтва неадукаваных — гэта спадчына, якую атрымала краіна Вялікага Кастрычніка з першых дзён свайго нараджэння і тут жа аб'явіла аб праве грамадзян на адукацыю. За кароткі тэрмін наша краіна стала краінай агульнай пісьменнасці. Цяпер адпаведна Канстытуцыі СССР уся моладзь павінна атрымаць сярэднюю адукацыю.

СССР — самая чытаючая краіна ў свеце. Краіна, дзе вучацца ўсе. Гэта — пра нас, пра кожнага асобна і пра ўсіх разам.

Чалавек мае патрэбу не толькі ў прафесійным удасканаленні. Духоўныя патрэбы вядуць яго ва універсітэт марксізму-ленінізму і народны універсітэт ведаў, у лекторый таварыства «Веды» і школу эканамічнай адукацыі...

Цяга да ведаў, імкненне самому разабрацца ў надзённых палітычных падзеях або дакрануцца да чыстых крыніц мастацтва, ні з чым не параўнальная прага пазнання — хіба гэта не адметная рыса характару савецкіх людзей! Іменна таму Дзень ведаў — свята ўсенароднае.

Доўга будзе помніцца 1 верасня тым юнакам і дзяўчатам, якія запоўнілі сёння аўдыторыі вышэйшых навучальных устаноў. Прыйшло папаўненне і да нас ва універсітэт. Разнастайныя алімпіяды, конкурсы работ па грамадскіх, прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках, факультэт грамадскіх прафесій, студэнцкія будаўнічыя атрады, словам, шматграннае жыццё адкрые перад студэнтамі новыя гарызонты ў авалоданні ведамі.

Вучэбны працэс ва універсітэце на 11 факультэтах забяспечваюць 105 кафедраў. Есць тры вучэбныя навуковыя станцыі, заалагічны, землязнаўства і гістарычны музеі, адзінаццаць навукова-даследчых галіновых і праблемных лабараторый, вылічальны цэнтр, СКТБ з вопытнай вытворчасцю. Пры універсітэце паспяхова працуюць два буйныя навукова-даследчыя цэнтры — Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі і Інстытут фізіка-хімічных праблем.

Важнае месца ва ўсім комплексе навучання займае практыка, якая арганізуецца і праводзіцца з улікам патрэб народнай гаспадаркі і навукова-тэхнічнага прагрэсу. Студэнты праходзяць вытворчую, вучэбную, педагагічную, грамадска-палітычную і азнаямленчую практыкі як у сваёй краіне, так і за мяжой. Яны практыкуюцца на заводах і фабрыках, у навукова-даследчых установах, школах, рэдакцыях газет, на радыё і тэлебачанні, удзельнічаюць у археалагічных і этнаграфічных экспедыцыях.

У Беларускім універсітэце авалодваюць ведамі каля 900 замежных студэнтаў, пасланцоў звыш 60 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Набываючы агульнаадукацыйныя і спецыяльныя веды, замежныя студэнты знаёмяцца з савецкім ладам жыцця, поспехамі камуністычнага будаўніцтва.

Асновай усіх поспехаў універсітэта ў развіцці навукі і высакаякаснай падрыхтоўкі спецыялістаў і яго гонарам з'яўляюцца кадры. Вучэбную, навуковую і палітыка-выхаваўчую работу ва універсітэце вядуць каля 5000 чалавек. Усе яны, не шкадуючы сіл і часу, перадаюць свае веды будучым маладым спецыялістам, клапатліва вучаць іх праяўляць пастаянную настойлівасць на шляху да вяршынь навукі.

Есць шмат асаблівасцей у сённяшняга Дня ведаў. Але, магчыма, галоўная з іх — высокі напал, з якім пачынаюць работу навучальныя ўстановы. Наперадзе — асаблівы год, год правядзення XXVII з'езда КПСС. Выдатная вучоба, паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу — вось наш падарунак з'езду.

У нашага свята ведаў рабочы настрой. Адзначаючы яго, мы па ленінскаму запавету засяроджваем сваю ўвагу на нявырашаных праблемах, перспектыўных задачах. Мы добра памятаем пра цану кожнай вучэбнай і працоўнай мінуты.

Сёння, у дзень пачатку новага навучальнага года гаворым усім выкладчыкам, студэнтам, супрацоўнікам: «У добры шлях! У добры шлях у цудоўную краіну ведаў, якая не мае межаў!».

ПАРТКОМ
РЭКТАРАТ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
ПРАФСАЮЗНЫЯ КАМІТЭТЫ

ШТОГОД пад гукі вальса выпускных вечароў з універсітэтам развітваюцца сотні выпускнікоў. Штогод тысячы юнакоў і дзяўчат накіроўваюць свае дакументы ў БДУ. Аднак праз выпрабаванні экзаменаў праходзяць далёка не ўсе. І толькі самыя падрыхтаваныя і самыя дастойныя ўліваюцца ў дружную студэнцкую сям'ю старэйшай ВНУ рэспублікі. Так, сёння каля трох тысяч абітурыентаў перастулаюць парог альма матэр ужо ў якасці першакурснікаў.

Вялікае значэнне маюць і дні адкрытых дзвярэй, якія штогод праводзіць кожны факультэт універсітэта з мэтай бліжэй пазнаёміць з сістэмай навучання па абранай спецыяльнасці. Толькі ў мінулым годзе звыш 10 тысяч навучэнцаў школ з усіх куткоў рэспублікі наведалі БДУ у час правядзення гэтых мерапрыемстваў.

Адметнай рысай работы прыёмнай камісіі ва ўсе часы былі пошукі «свайго» студэнта, якога, акрамя прафесіі, не трэба было вучыць любві да яе. У гэтай камісіі ў адборы найбольш таленавітых накіраванцаў педкалектываў.

На карысць такой думкі сведчыць і той факт, што пэўная колькасць абітурыентаў, якія мелі накіраванні, прадэманстравалі пасрэдныя, а часам і даволі нізкія веды.

Дарэчы, пра якасць падрыхтоўкі абітурыентаў. Як і ў папярэднія гады, яна пакідае жадаць лепшага. Амаль палова абітурыентаў ад агульнай колькасці не пацвердзілі свае атэстацыйныя адзнакі. Асабліва датычыцца гэта выпускнікоў сельскіх школ — асноўных прэтэндэнтаў на педагагічныя спецыяльнасці.

Кожны чацвёрты юнак ці дзяўчына, што скончылі сёлета школу з залатым медалём, пажадалі вучыцца ў нашай ВНУ. Да гэтай колькасці патрэбна дадаць яшчэ выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў з выдатнымі дыпломамі. На жаль, адзіны экзамен па прафіліруючаму прадмету здалі на выдатна не ўсе — толькі 65 працэнтаў. Прычым большасць сярод іх выпускнікі СПТВ, ГПТВ і тэхнікумаў. Учарашнія вучні падрыхтаваны крыху лепш. Толькі пятая частка не змагла пацвердзіць аб'ектыўнасць атрыманых у школе пяцёрак і высокі гарт залатых медалёў.

Не першы год выкарыстоўваюцца ва універсітэце ЭВМ для аблягчэння і паскарэння прыёму ўступных экзаменаў па дакладных дысцыплінах. Атрымаў сваё далейшае развіццё гэты эксперымент і сёлета. «Машынам здавалі» матэматыку абітурыенты геаграфічнага і хімічнага факультэтаў. Вядома, што пры такой арганізацыі прыёму прадмета захоўваецца цвёрдая аб'ектыўнасць. З другога боку ЭВМ не пад сілу ахапіць такія чыста чалавечыя якасці абітурыента, як кемлівасць, уменне схопліваць «на ляту» і разумець з паўслова. Калі раней экзаменатар бачыў, што хлопец ці дзяўчына маюць пэўныя веды і здольнасці, але разгубіліся ці, скажам, нешта недзе не давучылі, адзнака магла быць вышэйшай. Прымаўся ў разлік, як кажуць, чалавечы фактар. Цяпер жа абітурыенту прыходзіцца спадзявацца толькі на свае веды.

У пэўнай ступені палегчыў адбор іменна «сваіх» студэнтаў эксперымент, які праводзіўся на біялагічным, хімічным, механіка-матэматычным, фізічным факультэтах і факультэце прыкладной матэматыкі. Сутнасць яго заключалася ў тым, што пры здачы дзвюх прафіліруючых дысцыплін абітурыенты павінны былі прадэманстраваць выдатныя ці добрыя веды і набраць пэўную колькасць балаў. У асноўным эксперымент прайшоў удала.

Усе пералічаныя вышэй нaваўвядзенні па пашырэнню падрыхтоўкі настаўнікаў з універсітэцкім дыпломам у значнай ступені абудзілі цікавасць абітурыентаў да здачы ўступных экзаменаў па выбранай спецыяльнасці. Гэта часткова тлумачыць той факт, што заяў сёлета было прынята на 15 працэнтаў больш, чым летась. Адбыліся змены і ў якасным саставе абітурыентаў. Павялічылася колькасць маладых людзей, якія ўжо адслужылі ў радах Савецкай Арміі, маюць за плячыма два, а то і больш гадоў працоўнага стажу. Як ужо адзначалася, актывізаваўся «вясковы» абітурыент. Шмат заяў у прыёмную камісію паступіла з шэрагу раёнаў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай абласцей.

Традыцыйна самы вялікі конкурс быў на гістарычны і юрыдычны факультэты. Большая колькасць заяў і ад медалістаў была пададзена на гэтыя спецыяльнасці. Пасля ішлі палітэканомія, філасофія, геаграфія, руская мова, біялогія, хімія і матэматыка (вытворчыя аддзяленні).

У заключэнне хочацца павіншаваць першакурснікаў з Днём ведаў, які яны ўпершыню сустракаюць студэнтамі, і пажадаць плённай вучобы і змястоўнага студэнцкага жыцця.

## ПЕРШАКУРСНІК-85

# ШУКАЦЬ «СВАЙГО» СТУДЭНТА

**Першага верасня. Усесаюзны Дзень ведаў сабраў у сценах Беларускага дзяржаўнага універсітэта учарашніх абітурыентаў, сённяшніх першакурснікаў, чые прозвішчы можна прачытаць у спісах, што вывешаны ў вестыбюлі першага паверха фізічнага корпуса. У гэтым будынку адбываліся галоўныя падзеі сёлетняй прыёмнай кампаніі. Аб яе буднях наш карэспандэнт папрасіў расказаць адказнага сакратара прыёмнай камісіі дацэнта Расціслава Афанасьевіча ЖМОЙДЗЯКА.**

А заяў на ўсе факультэты было пададзена ў многа разоў болей.

Што абумовіла такі ўздым прэстыжу Белдзяржуніверсітэта? Адназначнага адказу на пытанне быць не можа. А ў якасці аднаго з галоўных складаемых фактараў хацелася б назваць карпатлівую і мэтанакіраваную работу прыёмнай камісіі па прафарыентацыі навучэнцаў сярэдніх школ і спецыяльных навучальных устаноў, працоўнай і вучнёўскай моладзі. Яшчэ задоўга да заканчэння вучэбнага года шэсць агітбрыгад, якія аб'ядналі 78 супрацоўнікаў універсітэта, выязджалі з гэтай мэтай у гарады і вёскі рэспублікі. Натуральна, што не толькі гэта садзейнічала выбару юнакоў і дзяўчат. Не першы год пры універсітэце плённа функцыяніруюць школы юных фізікаў, хімікаў, матэматыкаў, географаў, праграмістаў, журналістаў, філолагаў, юрыстаў, радыёфізікаў, гісторыкаў, біёлагаў. Завочна і на стацыянары тут займаецца каля дзвюх тысяч вучняў. Большасць з іх потым падаюць дакументы на тыя спецыяльнасці, па якіх вучыліся ў «школах юных». Практыка пераконвае, што большасць гэтых слухачоў становяцца нашымі студэнтамі. Ці адразу пасля заканчэння дзесяцігодкі, ці пасля, маючы за плячыма стаж работы, службу ў радах Савецкай Арміі і г. д.

Сярод абітурыентаў нямала ўдзельнікаў рэспубліканскіх вучнёўскіх алімпіяд, якія, як правіла, праводзяцца ў БДУ імя У. І. Леніна.

Практыка сведчыць, і сёлетнія ўступныя экзамены толькі пацвердзілі гэта, што добрыя адказы ў абітурыентаў, якія займаліся на стацыянарных, завочных і вячэрніх падрыхтоўчых курсах. Большая частка слухачоў паспяхова вытрымлівае конкурс і паступае на загадзя абраны факультэт.

Тым сэнсе сёлетні год не выключэнне. Хутчэй наадварот. Атрымаў далейшае пашырэнне пачаты ў 1984 годзе мэтавы набор юнакоў і дзяўчат па накіраваннях педагагічных калектываў і раённых аддзелаў народнай асветы, карыстаюцца льготамі жыхары з сельскай мясцовасці пры паступленні на факультэты, якія маюць педагагічныя аддзяленні. Тым самым практычна ажыццяўляецца сувязь вышэйшай і сярэдняй школы, у якой павінны быць зацікаўлены абодва бакі. Якога чалавека накіруюць да нас на вучобу, такога спецыяліста прымуць праз пяць гадоў у свой калектыў. Аднак патрэбна зазначыць, што не ўсе калектывы і аддзелы народнай асветы аднесліся з патрэбнай прынцыповасцю да выдачы накіраванняў на вучобу. А яны даюць вялікія магчымасці абітурыентам пры паступленні. Таму часам атрымлівалася, што троечнік з накіраваннем райана абыходзіў на ўступных экзаменах выдатніка, як гэта ні парадаксальна. Так было ў час здачы ўступных экзаменаў на геаграфічны факультэт, абодва аддзяленні філалагічнага. Сюды прынеслі свае заявы амаль толькі адны накіраванцы педкалектываў. Таму паступіць юнаку ці дзяўчыне нават з выдатнымі адзнакамі і высокімі здольнасцямі, але без накіравання, было літаральна немагчыма. Яны аказваліся, як кажуць, неканкурэнтназдольнымі. Думаецца, было б карысным на высокім узроўні прааналізаваць вынікі нaваўвядзення і ўнесці неабходныя карэктывы. Так, напрыклад, уяўляецца мэтазгодным загадзя ўдакладняць колькасць месц, адведзеных для студэнтаў з накіраваннямі і для тых, хто паступае, як кажуць, сам па сабе. Што гэта дасць? Надзею паступіць апошнім, сярод якіх нямала здольных юнакоў і дзяўчат. Большыя магчымасці прыём-

## ФОТАРЭПАРТАЖ

*«Вы здалі ўжо? Што здавалі?» — пыталіся ў мяне некалькі разоў, калі я ішла між характэрнага для часу ўступных экзаменаў натоўпу людзей каля дзвярэй галоўнага корпуса універсітэта. І нягледзячы на тое, што мае ўступныя экзамены былі даўно, хваляванне тых незабыўных дзён зноў ахапіла мяне.*

*Пара экзаменаў — сур'ёзнае выпрабаванне ведаў, здольнасцей. Учарашнія школьнікі з новымі атэстатамі сталасці. Яны, магчыма, упершыню ў жыцці прынялі самастойнае рашэнне: кім быць? Сёння яны абітурыенты. Першы экзамен. Пытанні, адказы, тэмы сачыненняў, рашэнне задач — усё тут. І бацькі з блакнотамі ў руках. Сёння ў іх таксама экзамен. А хвалююцца яны яшчэ больш за сваіх дзяцей. Слёзы радасці і расчаравання. Яны на вачах дзяцей і бацькоў...*

*Першай, каго я сустрэла, была Ала Ткачэнка. Дзяўчына падала дакументы на спецыяльнасць філасофія. У гэты дзень яна здавала грамадазнаўства і атрымала добрую адзнаку. Пра сябе Ала расказала:*

*— Я закончыла сярэднюю школу № 63 г. Мінска. Заўсёды прыцягвалі грамадскія*





## ВЕРАСЕНЬ: НА ПАРАДАК ДНЯ КАМСОРГА

# Працаваць — УДАРНА, вучыцца — ВЫДАТНА!

ВОСЬ І НАДЫШЛА пара развітвацца з летам. І хоць у дзень першага верасня заўсёды святочны настрой, усё ж час ад часу на загарэлых тварах юнакоў і дзяўчат паяўляецца смутак. Шкада так хутка праляцеўшага будатрадаўскага лета.

Сёння яны сустрэліся зноў. Уся твая група, камсорг, зноў у зборы. Шмат цікавага вы можаце расказаць адзін аднаму, парадавацца агульным поспехам: працоўны семестр здадзены на выдатна. А які́м быць новаму семестру — вучэбнаму? Гэта пытанне павінна стаць адным з галоўных на першым камсамольскім сходзе новага навучальнага года. І адказ на яго будзе адназначным: вучыцца толькі на выдатна. Выдатнай вучобай сустрэнем XXVII з'езд КПСС.

Ты ведаеш, камсорг, да нас ва універсітэт прыйшло папаўненне. У студэнтаў-першакурснікаў зараз асабліва напружаны час: выбары камсорга, камсамольскага актыву групы. Твой вопыт камсамольскай работы будзе вельмі карысным для навічкоў. Не ўпусці з поля зроку гэты важны момант. Падкажы, парай, дапамажы малодшым таварышам у такой нялёгкай справе, як станаўленне калектыву.

Хоць мы і гаворым, што працоўныя справы студэнтаў закончыліся, усё ж наперадзе многіх з іх чакае працоўны месяц верасень на сельгаспалетках. Працаваць па-ударнаму — такі дэвіз месяца. А для першакурснікаў гэта яшчэ і час пазнання адзін аднаго, час новых знаёмстваў і цікавых сустрэч.

І яшчэ, камсорг, згадзіся, размова будзе карыснай тады, калі ты не толькі будзеш улічваць нашы пажаданні, а і сам будзеш прапаноўваць, падказваць тэмы. Рэдакцыя чакае тваіх допісаў.

# КАМУ СПАДАРОЖНІЧАЕ ПОСПЕХ

*дысцыпліны. Філасофію пачала вывучаць самастойна. У школе вяла грамадскую работу, была членам камітэта камсамола. Пытаецеся, ці хвалююся? Вядома, не без гэтага. Але асаблівых падстаў для хвалявання няма. Атмасфера на экзаменах добразычлівая.*

*...Бацькі і абітурыенты шчыльна акружылі шчаслівую ўладальніцу пяцёркі Анжэлу Гусеву. Анжэла — медалістка. Яна на выдатна здала прафіліруючы прадмет і стала першакурсніцай юрфака.*

*— Магчыма, таму, што мама ў мяне юрыст і шмат расказвала мне пра сваю прафесію. Школьнае жыццё было цікавым, насычаным. Такімі я ўяўляю і студэнцкія гады. У школе я займалася і грамадскай работай. Харавому калектыву, удзельніцай якога была і я, прысвоена званне ўзорнага, і мы стараліся быць прыкладнымі ва ўсім.*

*Да экзаменаў рыхтавалася сур'ёзна. У многім дапамаглі падрыхтоўчыя курсы пры БДУ імя У. І. Леніна, якія я скончыла. Тут я навучылася самастойна працаваць, больш удумліва адносіцца да справы.*

*У размову ўступае Ніна Іванаўна, маці Анжэлы:*

*— Я таксама вельмі хвалявалася, хаця ў глыбіні душы была ўпэўнена ў грунтоўнасці ведаў Анжэлы. У свой час я скончыла БДУ, ужо шмат гадоў працую. Упэўнена, што мой практычны вопыт спатрэбіцца дачцы.*

*БДУ расчыняе дзверы не толькі для моладзі Беларусі. Узбекі, казахі, грузіны — таксама сёлетнія абітурыенты. БДУ імя У. І. Леніна запрашае кожнага, хто марыць быць настаўнікам ці юрыстам, гісторыкам ці матэматыкам, фізікам ці філосафам. Кожнага, хто адчувае ў сабе сілу творчай працы, глыбокія веды. І не бяда, што не ўсе вытрымалі ўступныя экзамены. Калі хто цвёрда вырашыў набыць тую ці іншую спецыяльнасць, універсітэт чакае яго ў наступным годзе. А першакурснікам хочацца пажадаць шчаслівых білетаў і выдатных адказаў у час першай у іх жыцці студэнцкай сесіі.*

***Г. БАЗЫЛЕНКА.***









НА ЗДЫМКАХ:

«Дзе тут шчаслівы білет?»

«Пытанняў болей няма» — сказаў экзаменатар і акуратна вывеў у экзаменацыйным лісце Святланы Цітовай «выдатна».

«Дазвольце з вамі не згадзіцца»,— запярэчыла Іра Шульганава. А праз некалькі хвілін сяброўкі віншавалі яе з выдатнай адзнакай.

Кожнага, хто выходзіць з аўдыторыі, літаральна засыпаюць пытаннямі.

Сачыненне пішуць абітурыенты гістарычнага факультэта.

Галоўнае — не губляць прысутнасці духу.

Фота В. ГРАМОВІЧА.

---

*ЖАДАЕМ ВАМ...*

## БУДЗЬЦЕ САПРАЎДНЫМІ ГРАМАДЗЯНАМІ!

ДАРАГІЯ ПЕРШАКУРСНІКІ! Горача і сардэчна віншую з пачаткам першага для вас навучальнага года ў нашым універсітэце. З гэтага часу вы студэнты БДУ імя У. І. Леніна — старэйшай ВНУ Беларусі, аднаго з вядучых універсітэтаў Краіны Саветаў.

Гэта вельмі ганарова і адказна. Кожны з вас, паступіўшы ва універсітэт, павінен атрымаць максімальную колькасць ведаў і максімальна праявіць сябе. Вучыцеся творча, як можна хутчэй пазбаўляйцеся ад шкалярскай псіхалогіі. Навучыцеся здабываць веды самастойна, глыбока асэнсоўваць вывучанае, даходзіць да сутнасці рэчаў. Выхоўвайце ў сабе культуру мышлення, любоў да глыбіні і прыгажосці думкі, уменне валодаць сабой, накіроўваць сваю волю, сваю свядомасць у патрэбнае рэчышча, пачуццё адказнасці, бо яно адно з самых істотных сведчанняў узроўню сацыяльнай, грамадзянскай і маральнай сталасці чалавека.

Вучыцеся з захапленнем, смела і таленавіта сцвярджайце сябе ў абранай спецыяльнасці. Ведайце, што засваенне вучэбнай праграмы універсітэта — толькі платформа, з якой яго выпускнік павінен адправіцца далей у самастойны шлях свайго прафесійнага ўдасканалення, у шлях бесперапыннага развіцця. Гэтага настойліва патрабуе час — час паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу і ўзрастаючай ролі адукацыі ў ідэалагічным супрацьборстве дзвюх сацыяльных сістэм.

Студэнцкія гады назаўсёды з вамі. Зрабіце іх творчымі, яркімі і незабыўнымі. Выхоўвайце ў сабе чуласць, добразычлівасць, будзьце людзьмі актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Жадаю вам стаць не толькі выдатнымі спецыялістамі, але і сапраўднымі грамадзянамі, палымянымі патрыётамі нашай сацыялістычнай Айчыны, перакананымі інтэрнацыяналістамі. Плённых вам поспехаў у гэтым, дарагія сябры! У добры шлях!

**М. БАРАНАВА,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду, заслужаная настаўніца БССР.**

## Каб успомніць з гонарам

НЕЛЬГА не здзіўляцца разважлівасці парад, якія даюць першакурснікам. Старэйшыя таварышы жадаюць, каб кожны студэнт добра вучыўся, не прапускаў заняткаў, займаўся грамадскай работай і спортам, удзельнічаў у мастацкай самадзейнасці, быў выхаваным, не растрачваў дарма лепшыя гады свайго жыцця, карацей, паступаў бы толькі добра і не паддаваўся б ніякім спакусам.

Асабліва павучальныя настаўленні тых, хто рабіў шмат памылак у студэнцкія гады.

Выконваючы парады гэтых вопытных людзей, вы будзеце пастаянна радаваць сваіх сяброў і блізкіх, выкладчыкаў і грамадскія арганізацыі. Пры выпадку вас будзе хваліць куратар, а то і дэкан.

Але, на жаль, і студэнцкія памылкі, і самыя лепшыя пажаданні і рэкамендацыі маюць адну агульную ўласцівасць — яны паўтараюцца.

Паўтаруся і я. Жадаю вам добра вучыцца, а акрамя гэтага займацца карыснымі справамі, пра якія заўсёды можна будзе ўспомніць з гонарам!

**С. ШУШКЕВІЧ,**
**загадчык кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі, прафесар, лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР за 1985 год.**

## Не адкладваючы на заўтра

**ДРУЖА-ПЕРШАКУРСНІК! Я віншую цябе з паступленнем у БДУ — флагман вышэйшай школы рэспублікі. Я шчыра рада за цябе і хачу сказаць вось што. Ты, напэўна, атрымаў ужо шмат парад. Перакана: многія запэўніваюць цябе, што галоўнае — і самае цяжкае — паступіць. Але хачу сказаць, што гэта не так. Самае цяжкае яшчэ будзе, бо дагэтуль ты паспеў здаць толькі чатыры (а хто і адзін) экзамены, а наперадзе яшчэ некалькі дзесяткаў. Так што расслабляцца няма калі. Прымайся за справу з першага дня, тады не патрэбна будзе штурмаваць прадмет у апошнюю ноч перад экзаменам.**

**І яшчэ. ВНУ — гэта першы крок да грамадзянскай сталасці. Жыццё патрабуе ад нас глыбокіх перакананняў, умення выкарыстоўваць іх на практыцы і, галоўнае, працаваць у адпаведнасці з імі. Усё гэта дапаможа набыць табе грамадская дзейнасць. Так што за справу, першакурснік!**

**Л. САКАЛОВА,**
выпускніца факультэта журналістыкі.

## Лета прыняла экзамен на выдатна!

Романтики двадцатого столетья,
Не на бортах крылатых каравелл,
Не на коне с клинком, где гром
и ветер,
А в нашем дне за этот день
в ответе,
Завиден и прекрасен ваш удел.
Романтики двадцатого столетья,
Я душу грел у вашего костра,
И не было отраднее на свете,
Чем этот жаркий трудный
пламень дня.

*КАЛІ ВЫ РАПТАМ адчулі лёгкае галавакружэнне, убачышы людзей у будатрадаўскай форме,— гэта нездарма. І хоць усе сімптомы захворвання не да канца вывучаны, усё ж галоўная лека знойдзена: хутчэй апранай будатрадаўскую форму, збірай патрэбныя рэчы — і ў дарогу.*

*Ад ляноты, лайдацтва і суму вылечыць будатрад. Смутак па рабоце і свежаму паветру, па вогнішчу і яркіх зорках — вось што такое сіндром будатрада,— так растлумачваюць сваю работу ў будатрадзе «Славяне» дзяўчаты філалагічнага факультэта.*

*Шмат добрых спраў зрабілі працавітыя «славянкі» за час працоўнага семестра ў калгасе імя Мічурына Стаўбцоўскага раёна, які ў гэтым годзе стаў месцам дыслакацыі атрада.*



***НА ЗДЫМКУ:** байцы атрада «Славяне» філалагічнага факультэта.*

**ЗВАРОТНЫ АДРАС — СБА**

## Названа вуліца Універсітэцкай

**Яны яшчэ не ведалі, што іх чакае наперадзе. Не ведалі, што праз некалькі гадоў пра іх напішуць газеты, не думалі пра будучыя поспехі і ўзнагароды. У мінулым было толькі падрыхтоўчае аддзяленне БДУ імя У. І. Леніна, уступныя экзамены. І — поўная свабода да кастрычніка.**

«А Я ЕДУ, а я еду за туманом» — выхваляючыся новенькімі курткамі з яркімі эмблемамі, «Рытм» накіроўваўся ў дарогу, у будатрадаўскія будні. З гадамі курткі выліналі, але малады запал, асабліваe пачуццё дарогі засталіся ў кожнага.

У атрадзе ўзялі за правіла: лёгкіх спраў не шукаць, працаваць з поўнай аддачай сіл. Як вырашылі, так і зрабілі. Атрад узяўся за нялёгкую справу — у калгасе «Савецкая Беларусь» Клецкага раёна Мінскай вобласці патрэбна было ўзводзіць жылыя дамы для вяскоўцаў і розныя сельскагаспадарчыя аб'екты.

Ужо ў першы свой прыезд у калгас атрад заявіў аб сабе як аб працалюбівым і дружным калектыве аднадумцаў. Вырас пабудаваны рукамі байцоў свінарнік, спецыяльныя памяшканні на ферме, як новыя сталі пасля капітальнага рамонту іншыя сельскагаспадарчыя аб'екты.

Але асобым, ганаровым заказам для атрада стала збудаванне жылых домікаў. Заўважым адразу, што пакуль атраду не пад сілу ўзвядзенне жылля ад «нуля» і пад ключ, усё ж не спецыялісты, а студэнты юрыдычнага факультэта. Магчыма, гэта справа будучага, вопыт, як кажуць, прыходзіць з гадамі. Але закласці фундамент новага будынка, падняць сцены — гэта будатрадаўцы могуць.

Сёння ў самым пачатку новай калгаснай вуліцы — не да канца забудаванай і не зусім добраўпарадкаванай — пакладзены камень-валун, на якім вялікімі літарамі высечана: «Вуліца названа Універсітэцкай у гонар працоўных поспехаў атрада «Рытм» БДУ імя У. І. Леніна». А далей — панарама гатовых, заселеных домікаў і тых, якія яшчэ будуць узведзены. І няхай пакуль вуліца Універсітэцкая невялікая — толькі шэсць домікаў на ёй,— яна будзе яшчэ расці і прыгажэць.

А пакуль давайце памарым. Пройдзе некалькі гадоў, і зазвініць вуліца вясёлымі дзіцячымі галасамі. Дзеці закончаць школу і, магчыма, нікуды не захочуць ехаць з роднага калгаса. Магчыма, яны і не ўспомняць юнакоў у будатрадаўскіх куртках, якія будавалі ў калгасе жыллё, добраўпарадкоўвалі вуліцы, але іх бацькі, што справілі наваселле ў дамах са зручнымі падворкамі, заўсёды будуць памятаць тых, хто ўручыў ім ключы ад новых кватэр.

У «Рытма» заўсёды было правілам: як ні цяжка на аб'екце, кожны дзень некалькі чалавек на чале з камісарам накіроўваліся на будаўніцтва помніка загінуўшым вяскоўцам у вёсцы Заляшаны. Да 40-годдзя вызвалення вёскі тут адбылося перазахаванне загінуўшых і адкрыццё помніка, пабудаванага байцамі будатрада.

Памятаеце цудоўную песню, якая стала ў нейкай ступені візітнай карткай Усесаюзнага студэнцкага атрада, дзе ёсць такія словы: «Не каждому дано так щедро жить — друзьям на память города дарить». Добрыя словы. І вось якая думка прыйшла мне раптам — кожны горад пачынаецца з невялікай вуліцы. Потым паяўляецца яшчэ адна, потым яшчэ. А потым на карце ўзнікае горад.

У гэтым годзе СБА «Рытм» юрыдычнага факультэта таксама працаваў у калгасе «Савецкая Беларусь». У яго саставе — новыя байцы. Яны дабудоўвалі Універсітэцкую вуліцу, закладзеную ў калгасе іх папярэднікамі.

Т. МАШУК.

**АТРАД: ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА**

## СЕМЕСТР У РАБОЧАЙ СПЯЦОЎЦЫ

ШУКАЮЧЫ базу «Аблсельгасэнерга» у Калодзішчах, я арыентаваўся не на здалёк заўважныя стрэлы вежавых кранаў. Ведаючы, што дыслацыруецца тут СБА «Касіяпея» універсітэта — будатрад, дзе працуюць толькі дзяўчаты,— я арыентаваўся... на песню. Хто-хто, а дзяўчаты абавязкова павінны працаваць з песняй...

Побач з ужо ўзведзеным цагляным будынкам круціліся лопасці падобнай на мельніцу станцыі, дзе размешваўся і падаваўся насосам па шлангу наверх, на другі паверх, раствор. А каля станцыі стаялі дзяўчаты з лапатамі і час ад часу дагружалі «мельніцу», і было ім, відаць, не да песень.

Даведаўшыся, што гэта байцы «Касіяпеі», я не паспеў з імі пазнаёміцца, таму што наверсе закрычалі: «Давай раствор!»

Работа ёсць работа, і мне давялося на нейкі час адкласці размову з дзяўчатамі. Зайшоў у будынак — там тынкавалі сцены пакояў.

Дзяўчаты — студэнткі мехмата — атрымалі другі разрад па спецыяльнасці тынкоўшчыка ў ПМК-140, дзе на працягу паўтара месяца кожны дзень пасля заняткаў па дзве гадзіны працавалі на аддзелцы дзевяностакватэрнага жылога дома ў Сцяпянцы. А зараз іх аб'ект — будучая кантора базы «Аблсельгасэнерга».

Па вопыту добра ведаю: калі камандзір будатрада на просьбу назваць некалькі прозвішчаў самых лепшых байцоў заяўляе, што ўсе працуюць выдатна, то яму можна верыць. Вось і камандзір «Касіяпеі» Наталля Біруля назвала мне прозвішчы сваіх сябровак: «Наталля Корзун, Таццяна Мурашка, Іна Краўчанка, наш майстар, Марына Бабеня. Ды і ўсе ў нас добра працуюць!» — закончыла дзяўчына.

Хадзіў я па паверхах, гутарыў з байцамі, глядзеў на іх работу і, прызнацца, чаму здзівіўся, дык гэта іх акуратнасці. Вось як, значыць, працуюць у нас дзяўчаты, а я песень чакаў.

Зразумела, не ўсё ішло гладка з самага пачатку. У першыя дні тынкавалі дзяўчаты нішы падаконнікаў для батарэй ацяплення. Ну як тут, здавалася б, вызначыць, ці якасна зроблена, ці роўна накладзены слой тынкоўкі?

Прафесійным сакрэтам падзялілася Вольга Трыгубовіч:

— Здаецца, усё добра зроблена, але адыдзі, прыгледзься — няроўна, «пад вуглом» сцяна атрымалася, хоць усяго на некалькі міліметраў хіба, а непрыемна.

**А потым нічога, «набілі руку», што называецца. Цяпер вока не падводзіць. Акінеш позіркам сцяну — і адразу відаць, дзе трэба раствору дабавіць, а дзе яго проста расцерці.**

Камісар Святлана Досіна расказвае:

**— Звычайна наш рабочы дзень праходзіў так. Прыязджаем з Мінска сюды раніцай на аўтобусе. Да дзесяці гадзін дзяўчаты займаюцца заціркай сцен, столі для выраўноўвання іх і чысткі. За гэты час паспяваюць падвезці і падрыхтаваць раствор, пачынаем тынкаваць.**

Дадае майстар Іна Краўчанка:

**— Спачатку мы спрабавалі працаваць усім атрадам разам, але вопыт падказаў — трэба ствараць брыгады. Аказалася, што лепш за ўсё працаваць, калі ў пакоі не больш за чатыры-пяць чалавек.**

Я папрасіў даць свой водгук аб рабоце студэнтак майстра прымаючай арганізацыі.

Юрый Мікалаевіч Галубятнікаў сказаў коратка:

**— Тут работа сама за сябе гаворыць. У нас ніякіх нараканняў няма. За экзамен па працы можна ставіць «выдатна».**

А. БАРАДАЧ.



*У БАЙЦОЎ атрада «Мерыдыян» факультэта прыкладной матэматыкі працоўнае лета прайшло ў дарозе. Праваднікі — вось прафесія, якую асвойвалі на працягу двух месяцаў будучыя матэматыкі. «Са сваімі абавязкамі спраўляліся выдатна» — так ацэньвалі работу пасажыры. І гэта, бадай, самая высокая адзнака, якую можна было атрымаць.*

***НА ЗДЫМКУ:** байцы атрада «Мерыдыян» Ала Атаповіч і Марыя Урбановіч з начальнікам поезда «Мінск — Сімферопаль», кавалерам ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга А. К. Чэрнікам перад адпраўкай у рэйс.*

*Фота У. КУНІЦЫНА.*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

1 верасня 1985 г.
Зак. 2874. АТ 07623.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.